# *§ 38–39–0. Палітычнае развіццё Беларусі ў XVI–XVIII стст.

**1. Судовая сістэма ў ВКЛ у XVI ст.** Да сярэдзіны XVI ст. у ВКЛ судовыя функцыі, як правіла, ажыццяўлялі прадстаўнікі дзяржаўнай адміністрацыі. Найвышэйшым судом быў *гаспадарскі суд*, які разглядаў найважнейшыя дзяржаўныя справы, сур'ёзныя маёмасныя спрэчкі і з'яўляўся апеляцыйным органам па справах ніжэйшых судоў. Суддзёй выступаў вялікі князь, ад 1468 г. яму дапамагалі вышэйшыя феадалы з Рады ВКЛ. У рэгіёнах судовая ўлада належала ваяводам, якія і ўзначальвалі *ваяводскія суды*. Ад XV ст. існаваў *вотчынны суд*, санкцыянаваны прывілеем Казіміра 1447 г. Вотчынны суд, дзе суддзя — або сам феадал, або прызначаная ім асоба дваровай адміністрацыі, пашыраў сваю юрысдыкцыю на залежных ад пэўнага феадала сялян або мяшчан. Нягледзячы на адвольны характар судаводства па адміністрацыйных і грамадзянскіх справах, цяжкія злачынствы павінны былі разглядацца згодна з заканадаўствам ВКЛ. Да XVIII ст. у Беларусі дзейнічаў абшчынны *копны суд*. Суддзямі ў такім судзе выступалі старцы — найбольш аўтарытэтныя ў абшчыне сяляне, аднак абавязковай была прысутнасць прадстаўніка земскага суда — вознага. Юрысдыкцыя суда была досыць шырокая: ад маёмасных спрэчак і адміністрацыйных правапарушэнняў да судаводства па крымінальных справах пераважна сялян, а часам і шляхты. Суд праходзіў у спецыяльна адведзеных месцах — каповішчах, рашэнні суда, аж да смяротнай кары, лічыліся канчатковымі і выконваліся, як правіла, неадкладна. Судовыя справы жыхароў гарадоў, дзе не было магдэбургскага права, разглядаліся *вайтоўскім судом*. У гарадах з магдэбургскім правам дзейнічалі *вайтоўска-лаўніцкі суд*, які разглядаў крыміналь-

ныя справы і маёмасныя спрэчкі, і *бурмістарска-радзецкі суд*, у юрысдыкцыю якога ўваходзіла вырашэнне спрэчак паміж мяшчанамі.

У выніку адміністрацыйнай рэформы 1565–1566 гг. адбыліся сур'ёзныя змены ў судовай сістэме ВКЛ. На змену ваяводскаму суду прыйшлі замкавы (гродскі) і земскі павятовы суды. Замкавы суд, на чале якога звычайна знаходзіўся ваявода або староста, разглядаў найбольш цяжкія злачынствы асоб, затрыманых на месцы злачынства. *Земскі павятовы суд*, які займаўся крымінальнымі і грамадзянскімі справамі, абіраўся са шляхціцаў пэўнага павета. Яго сесіі адбываліся 3 разы на год. Пазямельныя спрэчкі паміж шляхтай вырашаў *падкаморскі суд*, што складаўся з падкаморыя, якога прызначаў вялікі князь з чатырох кандыдатаў ад павятовай шляхты, а таксама каморнікаў і пісара.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**З граматы Стэфана Баторыя аб стварэнні Галоўнага Трыбунала Вялікага Княства Літоўскага, 1581 г.**

«На тых сойміках кожнае ваяводства, зямля або павет абіраці маюць і будуць павінны між сабою асоб годных, богабаязных, цнатлівых правоў і звычаяў таго панства ВКЛ».

*1. Якія патрабаванні прад'яўляліся да суддзяў Галоўнага Трыбунала ВКЛ?*
*2. Пра які прынцып фарміравання вышэйшага суда ВКЛ сведчыць гэты фрагмент гістарычнага дакумента?*

У 1581 г. быў створаны вышэйшы апеляцыйны суд ВКЛ — *Трыбунал Вялікага Княства Літоўскага*, які шмат у чым прыйшоў на змену гаспадарскаму суду. Суддзямі маглі быць толькі ўраджэнцы ВКЛ, якіх штогод абірала шляхта, а судовыя рашэнні прымаліся большасцю галасоў. Сесіі Галоўнага Літоўскага Трыбунала ладзіліся ў Навагрудку, Мінску, Гродне. Яму былі падсудныя скаргі на прысуды земскіх,

паркавых, падкаморскіх судоў. Трыбунал пачаў сваю дзейнасць у 1582 г. і функцыянаваў да апошняга падзелу Рэчы Паспалітай.

**Судовая сістэма ВКЛ у XVI ст.**

| Тып | Характарыстыка | Склад | Юрысдыкцыя |
|---|---|---|---|
| Гаспадарскі суд | Вышэйшы суд | Вялікі князь, радныя паны | Найважнейшыя дзяржаўныя справы, апеляцыі па справах ніжэйшых судоў, справы аб прыналежнасці да шляхецкага саслоўя, скаргі на службовых асоб |
| Трыбунал ВКЛ (Галоўны літоўскі трыбунал) | Вышэйшы апеляцыйны суд | Абраныя шляхтай суддзі | Апеляцыі па справах замкавых, земскіх, падкаморскіх судоў |
| Замкавы (гродскі) суд | Суд у павеце | Ваявода або староста | Крымінальныя справы шляхты, мяшчан і сялян |
| Земскі (павятовы) суд (ад 1564 г.) | Выбарны павятовы шляхецкі суд | Земскі суддзя, падсудак, земскі пісар | Крымінальныя справы і грамадзянскія спрэчкі шляхты |
| Падкаморскі суд (ад 1565 г.) | Прафесійны павятовы шляхецкі суд | Падкаморый | Грамадзянскія справы па зямельных пытаннях |
| Вайтоўска-лаўніцкі суд | Суд у гарадах з магдэбургскім правам | Войт, лаўнікі | Крымінальныя, адміністрацыйныя справы, маёмасныя спрэчкі |
| Бурмістарска-радзецкі суд | Суд у гарадах з магдэбургскім правам | Бурмістр, радцы | Грамадзянскія справы мяшчан |
| Копны суд | Абшчынны сялянскі суд | Копныя мужы (старцы) | Крымінальныя справы і грамадзянскія спрэчкі сялян, у некаторых выпадках і шляхты |
| Вотчынны суд | Суд феадала над залежным насельніцтвам | Феадал або ўпаўнаважаная ім асоба | Крымінальныя і грамадзянскія справы ў дачыненні да залежных сялян і гараджан |

Па якой прыкмеце была сфарміравана судовая сістэма ВКЛ? Якія яе характарыстыкі былі найбольш перадавыя для свайго часу?